*С.В. Зыгмантовіч,*
*загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук*

*В.І. Саітава,*
*дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# НАВУКОВАЯ ФУНКЦЫЯ БІБЛІЯТЭКІ Ў ГАЛІНЕ КРАЯЗНАЎСТВА

Накіраванасць на навукова-даследчую дзейнасць уласціва краязнаўству як грамадскай з’яве. У азначэннях краязнаўства фіксуецца, што гэта дзейнасць па ўсебаковым вывучэнні рэгіёнаў/населеных пунктаў, якую вядуць мясцовае насельніцтва і спецыялісты навуковых устаноў [5]. Тэрмін *краязнаўства* разглядаецца таксама і як комплекс навуковых дысцыплін, аб’ектам вывучэння якога з’яўляюцца тэрыторыі ўнутры краіны. У краязнаўстве выкарыстоўваюцца шматлікія метады навуковых даследаванняў. Тэндэнцыя развіцця навуковых даследаванняў характэрная для сучаснага бібліятэчнага краязнаўства ў свеце.

У прынятых у шэрагу бібліятэк Расіі «Палажэннях аб краязнаўчай дзейнасці…» асобныя пазіцыі характарызуюць арганізацыю і кірункі навукова-даследчай працы (напрыклад, «Положение о краеведческой деятельности Псковской областной универсальной научной библиотеки» (http://www.pskovlib.ru/info/kraeveddelo.php); асноўныя мэты і задачы навукова-даследчай дзейнасці публічных масавых бібліятэк абгрунтавана раскрыты ў падрыхтаваных РБА «Руководстве по краеведческой деятельности муниципальных публичных библиотек (централизованных библиотечных систем)» і аналагічным дакуменце для цэнтральных бібліятэк суб’ектаў РФ (вобласці, края) [3]. У кіраўніцтве адзначана, што навукова-даследчая дзейнасць ЦБС цесна звязана з практычнымі задачамі фарміравання краязнаўчых рэсурсаў і абслугоўвання чытачоў. Яна носіць пераважна прыкладны характар і засноўваецца на выніках вывучэння інфармацыйнай забяспечанасці краязнаўчых аб’ектаў на сваёй

тэрыторыі. На самай справе краязнаўчыя даследаванні ў многіх муніцыпальных публічных бібліятэках выходзяць за межы фарміравання краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў і абслугоўвання карыстальнікаў.

Бібліятэчнае краязнаўства ў Беларусі, якое выдзяляецца на падставе форм і галін краязнаўства, выйшла з-за рамак практычнай дзейнасці ў другой палове XX ст. і на працягу апошніх дзесяцігоддзяў нарошчвае свой навуковы патэнцыял. Суб’екты бібліятэчнага краязнаўства: бібліятэкары-бібліёграфы-краязнаўцы, якія працуюць у публічных і спецыяльных бібліятэках, выкладчыкі БДУ культуры і мастацтваў, Магілёўскага бібліятэчнага каледжа, аспіранты, магістранты. Менавіта бібліятэкары-практыкі ўносяць важнейшы ўклад у краязнаўчыя даследаванні бібліятэк: распрацоўваюць іх тэматыку і праграмы, інструментарый правядзення, ацэньваюць і ўкараняюць вынікі.

Тэматыка і праекты навуковых даследаванняў па краязнаўстве ўсё часцей плануюцца бібліятэкамі, уваходзяць у кірункі дзейнасці краязнаўчых аддзелаў і сектараў бібліятэк, навукова-метадычных аддзелаў, аддзелаў маркетынгу, бібліятэказнаўства і інш. Акрамя таго, значны плён прыносяць асабістыя даследчыцкія захапленні асобных бібліятэкараў. Важна адзначыць, што абласныя бібліятэкі Беларусі, прымаючы актыўны ўдзел у міжнародным бібліятэчным супрацоўніцтве, вызначаюць навуковыя даследаванні як кірунак сумеснай дзейнасці. Пацвярджэннем гэтаму, з’яўляюцца, напрыклад, пагадненні, якія заключаюцца Гомельскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна з бібліятэкамі Расіі, Украіны, Літвы. Так, у «Соглашении о сотрудничестве…» з Каўнаскай абласной публічнай бібліятэкай адзначаны абавязкі па правядзенні «научных исследований в области библиотековедения, библиографоведения, книговедения; обсуждения проблем, имеющих взаимный интерес; представительства и участия в работе временных профессиональных команд, создаваемых обеими сторонами для решения задач, представляющих взаимный интерес» [4]. На наш погляд, у такіх дакументах варта ўказваць і краязнаўства як адну з прыярытэтных галін навуковых даследаванняў.

Навуковыя даследаванні бібліятэк па краязнаўстве развіваюцца пераважна ў кірунку пошукава-даследчай дзейнасці, калі мэтанакіравана і паслядоўна выкарыстоўваюцца пошукавыя і пазнавальныя дзеянні, якія дазваляюць выявіць і ахарактарызаваць прадметы пошуку: факты, з’явы, падзеі, асобы і інш. Спецыфіка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчай дзейнасці бібліятэк заключаецца ў тым, што фактамі, на якія скіраваны пошук і пазнавальныя працэдуры, як правіла, з'яўляюцца дакументныя крыніцы інфармацыі. Прымяненне кнігазнаўчых і бібліяграфічных метадаў пазнання дакументаў (тэкстаў) – шлях стварэння краязнаўчых гісторыка-кніжных і бібліяграфічных ведаў. Яны ўвасабляюцца ў стварaемых калекцыях краязнаўчых і мясцовых дакументаў, у краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсах, у выпрацоўцы метадычных рашэнняў у адносінах да працы з дакументальнымі крыніцамі інфармацыі. Гэты пошукава-даследчы кампанент практычнай дзейнасці бібліятэкі па краязнаўстве прысутнічае заўсёды, таму што абумоўлены як уваходжаннем навуковых ведаў у практычную дзейнасць, так і самім характарам краязнаўства. Выдатна гэты кірунак пошукава-даследчай дзейнасці развіваецца ў Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна, дзе ствараецца дасканалая сістэма краязнаўчых бібліяграфічных ведаў. Гэта сістэма навукова-дапаможных і папулярных краязнаўчых бібліяграфічных выданняў, камбінаваныя («Край мой, Магілёўшчына») і бібліяграфічныя базы даных.

Акрамя таго, у дзейнасці бібліятэкараў па краязнаўстве вызначылася і пашыраецца тэндэнцыя выкарыстання метадаў гістарычных даследаванняў: гісторыка-генетычнага, ідэаграфічнага і іншых, з дапамогай якіх узнаўляюцца з найбольшай паўнатой і дакладнасцю падзеі мінулага, «белыя плямы» рэгіянальнай гісторыі. Вынікі гэтай плыні пошукава-даследчай дзейнасці ўвасабляюцца ў разнастайнай навуковай прадукцыі: артыкулах, дакладах і інш. Прыкладам пошукава-даследчай дзейнасці, які ярка ілюструе гэту тэндэнцыю, з'яўляецца стварэнне сельскімі бібліятэкамі Беларусі пад кіраўніцтвам метадычных цэнтраў «Летапісаў вёсак» – унікальных крыніц рэгіянальнай памяці.

У практыцы нярэдка адбываецца цесная сувязь даследчых і навукова-метадычных функцый абласных бібліятэк, асабліва ў дачыненні да дзейнасці па пераўтварэнні мясцовых і краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, распаўсюджванні краязнаўчых ведаў.

Даследаванні бібліятэк па краязнаўстве тэрытарыяльна лакалізаваны і пакуль на ўзроўні рэспублікі не абагульняліся. Хаця абмеркаванне кірункаў, форм, вынікаў і перспектыў краязнаўчых даследаванняў бібліятэк бачыцца наспеўшай задачай Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі як навукова-метадычнага і каардынацыйнага цэнтра бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, тое ж варта было

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

б здзейсніць і на абласным узроўні. Канстатуючы, з аднаго боку, інтарэс да краязнаўчых даследаванняў, а з другога боку, пэўную стыхійнасць самой даследчай дзейнасці, мы звязваем няпэўнасць становішча і з адсутнасцю ў абласных бібліятэк статусу навуковых установ. У Беларусі, як і ў Расіі, згодна існуючай справаздачнасці, не адлюстроўваецца НДР як самастойны від дзейнасці і, адпаведна, няма непасрэднай залежнасці паміж правядзеннем НДР і фінансаваннем бібліятэк [1]. Тым не менш навукова-даследчая дзейнасць па краязнаўстве на сучасным этапе можа разглядацца ў ліку прыярытэтных кірункаў навукова-даследчай работы абласных бібліятэк. Мэтай яе перш за ўсё з'яўляецца ўдасканаленне практычнай краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, папаўненне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў рэгіёна, вывучэнне магчымасцей інтэлектуальнага доступу да іх, папаўненне ведаў аб крыніцах краязнаўчай інфармацыі, удасканаленне фактаграфічнай асновы для краязнаўчай дзейнасці. Усё гэта таксама садзейнічае ўдасканаленню бібліяграфічнай і фактаграфічнай асновы для развіцця ўсіх іншых форм і відаў краязнаўчай дзейнасці.

Разам з тым абласныя бібліятэкі пачалі выкарыстоўваць унікальныя рэсурсы і высокую інтэлектуальную актыўнасць бібліятэчных супрацоўнікаў, занятых краязнаўствам, у мэтах вырашэння навуковых пытанняў вывучэння рэгіёнаў, пераважна гуманітарнага характару: гістарычных, літаратурных, мастацкіх, моўных і інш. Такім чынам, фіксуюцца дзве асноўныя мэты навуковай краязнаўчай дзейнасці абласных бібліятэк: 1) даследаванні традыцыйнага кірунку, якія ахопліваюць бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства ў рэгіёне ў рэсурсным і сэрвісных аспектах. Новае ў іх ажыццяўленні праяўляецца праз распрацоўку і рэалізацыю інавацыйных краязнаўчых праектаў; 2) уключэнне бібліятэкараў-бібліёграфаў-краязнаўцаў у даследаванні па іншых галінах краязнаўства. Дзякуючы гэтым даследаванням узбагачаюцца веды і ўяўленні аб мясцовай гісторыі, этнаграфіі, геаграфіі, сямейна-родавай гісторыі і іншых галінах і тэмах. У адзінстве гэтыя плыні паказваюць сучасную навуковую дзейнасць бібліятэк як складаную па мэтах і кірунках з'яву.

Абласныя бібліятэкі ажыццяўляюць краязнаўчыя даследаванні самастойна, арганізуюць даследаванні ў цэнтралізаваных бібліятэчных сістэмах, удзельнічаюць у даследчых праектах іншых установ і арганізацый. У апошнія дзесяцігоддзі яны выступаюць як арганізатары буйных навукова-даследчых праектаў, кансалідуючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іншых суб'ектаў навуковай дзейнасці па краязнаўстве. У такіх выпадках абласная бібліятэка выступае галоўным распрацоўшчыкам даследчага праекта, каардынуе ўзаемадзенне з іншымі ўдзельнікамі даследавання, апрацоўвае вынікі, ажыццяўляе іх публікацыю.

Сярод такіх праектаў буйнейшымі з'яўляюцца міжнародныя і рэспубліканскія навукова-практычныя канферэнцыі і чытанні, рэгіянальныя і міжнародныя праекты, праграмы, падрыхтоўка навуковых выданняў.

Навуковыя канферэнцыі трывала ўвайшлі ў дзейнасць абласных і асобных публічных бібліятэк. Бібліятэкі выступаюць як ініцыятары і арганізатары гэтай формы навукова-даследчай дзейнасці, таму што наладзілі сувязі з шырокім колам краязнаўчых музеяў, універсітэтаў, школ, інстытутаў НАН і іншых цэнтраў, карыстаюцца падтрымкай мясцовых улад, органаў упраўлення культурай.

На канферэнцыях аналізуюцца дасягненні па фарміраванні фондаў краязнаўчых дакументаў, удасканаленні краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату, дзейнасці па папулярызацыі здабыткаў рэгіянальнай культурнай спадчыны і эканамічнага развіцця, выпрацоўваюцца перспектыўныя кірункі бібліятэчна-інфармацыйнага краязнаўства. У Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай АБ правядзенне навуковых канферэнцый па краязнаўчай праблематыцы стала традыцыйнай формай НДР. Так, Гомельская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна шмат гадоў займаецца вывучэннем спадчыны выдатнага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Расійскай імперыі, чыё жыццё і дзейнасць былі звязаны з Гомелем, М. П. Румянцава і з'яўляецца адным з арганізатараў «Румянцаўскіх чытанняў». Грунтоўнасцю праблематыкі вызначаюцца канферэнцыі Брэсцкай і Гродзенскай АБ. Напрыклад, у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (2008) прымалі ўдзел даследчыкі з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны з дакладамі па гісторыі кніжнай культуры края, аб лёсе мясцовых бібліятэк і архіваў, рэдкіх і малавядомых бібліяграфічных крыніцах, прысвечаных Брэстчыне. Гродзенская АБ імя Я. Ф. Карскага праводзіць навукова-практычныя канферэнцыі пад назвай «Гарадзенскія краязнаўчыя чытанні». Чытанні прысвячаліся выдатным падзеям і асобам гісторыі края: да 230-годдзя «Газеты Гродзеньскай», 880-годдзя Гародні, 240-годдзя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гродзенскага тэатра Тызенгаўза, да 660-годдзя Вітаўта, князя Гарадзенскага, Трокскага і Вялікага князя Літоўскага, да 170-годдзя з дня нараджэння Элізы Ажэшкі «Пісьменніца. Грамадскі дзеяч. Жанчына». У бягучым годзе бібліятэка пачынае новы навуковы праект «Шчорсаўскія чытанні».

Падобныя з’явы назіраюцца і ў дзейнасці ЦБС – лідараў краязнаўчага руху ў рэспубліцы. Уражвае навуковае прадстаўніцтва на I і II міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Колодеевские чтения», арганізаванай Барысаўскай ЦРБ, дзе шырока былі прадстаўлены вучоныя, супрацоўнікі музеяў і іншыя даследчыкі з розных устаноў Беларусі, Францыі (на I канферэнцыі), Расіі (на II канферэнцыі). Разам з імі з дакладамі выступілі супрацоўнікі залы беларусікі і краязнаўства ЦРБ.

Рэгіянальныя праграмы і праекты, такія, як «Жывая памяць Гомельшчыны», «Віртуальная рэканструкцыя спадчыны Ю. І. Крашэўскага» і іншыя, з’яўляюцца не толькі выдатным укладам у фарміраванне рэгіянальнага кампаненту нацыянальнай інфармацыйнай прасторы, але і вызначаюцца складанымі пошукава-даследчымі задачамі. У ходзе іх рэалізацыі ажыццяўляецца абмен метадамі, вопытам даследчай дзейнасці паміж галінамі краязнаўства: бібліятэчна-бібліяграфічным, кнігазнаўчым, гістарычным, этнаграфічным і іншымі, абмен набыткамі навуковага вопыту, метадалогіі краязнаўцаў розных краін. Так, у праекце «Віртуальная рэканструкцыя спадчыны Ю. І. Крашэўскага» разам з Брэсцкай абласной бібліятэкай імя М. Горкага удзельнічаюць НББ, Ровенская дзяржаўная абласная бібліятэка (Украіна), Бялападляская гарадская публічная бібліятэка і музей-сядзіба Ю. Крашэўскага (Раманава, Польшча). Плануецца прадставіць у алічбаванай форме багацейшую літаратурную спадчыну знакамітага ўраджэнца Брэсцкага краю і стварыць інтэграваны бібліяграфічны рэсурс для арыентацыі ў дакументальным масіве, звязаным з яго імем. Усё гэта дазволіць актуалізаваць імя Ю. Крашэўскага ў навуковым, адукацыйным і асветніцкім працэсах, забяспечыць доступнасць да створаных рэсурсаў шырокіх колаў карыстальнікаў.

Лагічна, што вынікі навуковых даследаванняў бібліятэк знаходзяць адлюстраванне ў разнастайных публікацыях, буйнейшымі сярод якіх з’яўляюцца зборнікі матэрыялаў навуковых канферэнцый. Асобай адзнакі заслугоўвае Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна, якая разам з абласным краязнаўчым музеем, дзяржаўным універсітэтам імя А. А. Куляшова ўдзельнічае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў выпуску серыяльнага выдання – навуковага зборніка «Магілёўшчына». Удзел у публікацыі вынікаў навуковых даследаванняў сведчыць аб прызнанні абласных бібліятэк дастойнымі партнёрамі краязнаўчых музеяў і ўніверсітэтаў – прызнаных суб'ектаў навуковай інфраструктуры краязнаўства.

Падсумоўваючы высновы аб перспектывах даследаванняў бібліятэк краіны, мяркуем, што даследчая дзейнасць па краязнаўстве патрабуе як распрацоўкі перспектыўных комплексных рэгіянальных праграм, так і адлюстравання іх у перспектыўных комплексных праграмах навуковых даследаванняў па бібліятэчнай справе краіны [5]. Гэта дазволіць вызначыць мэты, тэматыку, формы даследаванняў на доўгатэрміновую перспектыву, пашырыць кола ўдзельнікаў, абгрунтаваць формы прадстаўлення іх вынікаў і шляхі распаўсюджання новых краязнаўчых ведаў у рэгіянальнай і сусветнай прасторы. Вынікі даследаванняў абласных бібліятэк па краязнаўстве ўжо могуць быць падставай для хадайнічання аб наданні ім статусу навуковых цэнтраў з адпаведнымі пасадамі ў аддзелах/сектарах краязнаўства.


1. *Библиотеки* и научное сообщество: взаимодействие и взаимовлияние // Библиотековедение. – 2011. – № 5. – С. 19–23.

2. *Кірухіна, Л.* Перспектывы развіцця бібліятэк Рэспублікі Беларусь : да праекта праграмы «Развитие библиотечного дела Республики Беларусь на 2011–2015 гг.» / Л. Кірухіна // Бібліятэчны свет. – 2010. – № 2. – С. 11–13.

3. *Руководство* по краеведческой деятельности муниципальных публичных библиотек (централизованных библиотечных систем) ; Руководство по краеведческой деятельности центральной библиотеки субъекта РФ (области, края) [Электронный ресурс] // http : //www.rba.ru/content/ about/ doc/ruk_kraeved.php.

4. *Соглашение* о сотрудничестве между Гомельской областной универсальной библиотекой им. В. И. Ленина (Республика Беларусь) и Каунасской областной публичной библиотекой (Литовская Республика) // http : //goub.org/article/a-676.html.

5. *Энцыклапедыя* гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1997. – Т. 4.– С. 257.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ